*Літ.*: З а й к о ў с к і Э. Багі старажытнай Беларусі. Язычніцкі пантэон: Вялес. Хто такія Кацярына і Сцяпан? // Роднае слова. 1996. № 12; Беларускі народны каляндар. Мн., 2002; Прыказкі і прымаўкі. Мн., 1976.

*М. А. Бабчанок.*

**СЦЯПА́Н**, прысвятак *народнага календара*. Адзначаўся 26 снежня (9 студзеня н.ст.) як працяг *Каляд*. Здаўна лічыўся днём найму батракоў, слуг. У народзе казалі: «На святога Сцяпана кажан парабак сабе пан», «На святога Сцяпана парабак лепшы за пана», «На святога Сцяпана знайду другога пана». У хрысціянскім календары ў гэты дзень адзначаецца памяць пра апостала першапакутніка і архідыякана Стафана, які быў ілжыва абвінавачаны ў богаадступніцтве і забіты камянямі. Герб Святога Стафана 23.2.1792 нададзены гораду Радашковічы. Фалькл. вобраз С. ў нар. паданнях пра «Багатыр-гару», пра Сіні калодзеж згадваецца разам з вобразам багатыркі Кацярыны, якая была яго каханаю. На Беларусі імя Сцяпан нярэдка маюць камяні (адзін з Барысавых камянёў у в. Высокі Гарадзец Талачынскага раёна, Сцёп-камень у Докшыцкім раёне). Рускія даследчыкі В.Іваноў і У.Тапароў лічаць, што С. стаў своеасаблівай заменай Грамавіка, Перуна. Бел. археолаг Э.Зайкоўскі вобраз С. звязвае з Вялесам. С. лічаць апекуном свойскай жывёлы, асабліва коней, у гэты дзень праводзяцца гулянні з песнямі, танцамі, гульнямі і забавамі моладзі, спецыяльнымі абрадавымі дзеяннямі, накіраванымі на забеспячэнне багацця і дастатку ў сям'і.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ